Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

*Факультет иностранных языков*
*Кафедра немецкой филологии и лингводидактики*

# *ЛИНГВОКУЛЬТУРНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В СИСТЕМЕ ВУЗОВСКОЙ ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ*

**Сборник научных трудов**

Брест, Беларусь – 2019

УДК 81+37
8(063) ISSN

*Рецензенты:*

Сенкевич В.И., доктор филологических наук, профессор
Мельникова З.П., доктор филологических наук, профессор

*Редакционная коллегия:*

**В.Ф. Сатинова**, кандидат педагогических наук,
профессор **Л.Я. Дмитрачкова**, кандидат педагогических
наук, доцент **Е.Д. Осипов,** кандидат педагогических
наук, доцент
**Л.М Максимук**, кандидат филологических наук, доцент
**Е.Г. Сальникова**, кандидат филологических наук, доцент

**Лингвокультурное образование в системе вузовской подготовки специалистов** : сборник научных трудов / Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина ; под общ. ред. В.Ф. Сатиновой. – Брест : БрГУ им. А.С. Пушкина, 2019. – 411 с.

Проблемы лингвокультурного образования в системе вузовской подготовки специалиста анализируются с позиций философии, культурологии, психологии, педагогики, лингвистики, лингводидактики, теории и технологии иноязычного образования и др. В результате обмена опытом индивидуального и коллективного научного поиска выявляются современные тенденции развития языкового образования и актуальные проблемы профессиональной подготовки специалистов в контексте диалога культур и цивилизаций, решаются вопросы создания технологических образовательных моделей в сфере иноязычного образования.

УДК 808.26 – 541.2

Бут-Гусаім Святлана Феадосьеўна
Дацэнт кафедры беларускай філалогіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, г. Брэст
e-mail svfbg@tut.by

# ЖАНРАЎТВАРАЛЬНАЯ РОЛЯ ОНІМАЎ У КАНТЭКСЦЕ НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНАЙ ЛІТАРАТУРЫ МІКАЛАЯ ПАШКЕВІЧА, МІКАЛАЯ МІЦКОВІЧА І ВАСІЛЯ САРЫЧАВА

Анатацыя: У артыкуле разгледжаны ўжытыя ў навукова-папулярнай літаратуры берасцейскіх пісьменнікаў онімы. Асэнсавана нацыянальна-культурная інфармацыя антрапонімаў. Тапонімы праанлізаваны паводле суадносінаў з сучасным іменасловам. Апісана сэнсавая нагрузка "фонавых" онімаў, якія захавалі інфармацыю пра матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў.
Ключавыя словы: онім, антрапонім, паэтонім, тапонім, эклезіёнім, мянушка, патронім, прозвішча.

But-Gusaim Svetlana Feodosievna
Associate professor of the Chair of Belarusian Philology of Brest State University named after A. S. Pushkin

# GENRE FORMING FUNCTION OF ONIMS IN THE CONTEXT OF POPULAR SCIENTIFIC LITERATURE BY NIKOLAY PASHKEVICH, NIKOLAY MICKIEWICZ AND VASILY SARYCHEV

Abstract: The article views onims, used in popular scientific literature by modern Brest writers. The author gives the study of national and cultural information of anthroponyms. Placenames are analyzed from the point of view of their correlation with modern naming function. Semantic weight of "background" onims, which carry information about material and spiritual culture of the Belarusians, is described.
Keywords: Key words: onim, anthroponym, poetonym (poetic name), placename, eclectic name, nickname, patronym, surname.

У навукова-папулярных тэкстах веды аб прыродзе, чалавеку, культуры атрымліваюць выразнае адлюстраванне. Разнастайныя аспекты нацыянальнай культуры асабліва ярка раскрываюцца пры антрапацэнтрычным падыходзе да вывучэння такой тэкставай адзінкі, як онім. Творцы выкарыстоўваюць рэальныя гістарычныя, геаграфічныя і іншыя імёны ўласныя, якія абазначаюць асобасныя, часавыя і прасторавыя вяхі. Імя, выкарыстанае ў навукова-папулярным творы, – з'ява, якая дазваляе прасачыць змены ў сістэме мовы, абумоўленыя гістарычнымі, сацыяльнымі і культурнымі падзеямі, характэрнымі для соцыуму. Онімы ўдзельнічаюць у стварэнні сэнсавай шматмернасці асноўных змястоўных універсілій тэксту: чалавек – час – прастора. Адзінкі прапрыяльнай лексікі

становяцца важным сэнсава- і стылеўтваральным элементам інфармацыйнай прасторы тэксту.

Мэта прадстаўленага артыкула – онамапаэтычнае і лінгвакультуралагічнае апісанне ўжытых у творах Мікалая Пашкевіча, Мікалая Міцковіча і Васіля Сарычава паэтонімаў.

Зборнік педагога, пісьменніка, навукоўца Мікалая Пашкевіча "У родным слове адгукаецца душа" ўключае апавяданні, эсэ, мініяцюры, у якіх – шчымлівы і шчыры ўспамін пра маленькую радзіму пісьменніка – вёску Рубель, што на Століншчыне. Аўтар піша: "Гэта кніга пра гаворку жыхароў вёскі Рубель Столінскага раёна, пра тое, як слова дапамагае адчуць повязь са сваімі продкамі, убачыць непаўторнае хараство родных мясцінаў. Кніга адрасуецца ўсім, хто душою адгукаецца на роднае слова, каб пачуць голас сваіх продкаў, каб падаць голас сваім нашчадкам" [2, с. 3]. Зборнік Мікалая Міцковіча "Тапанімічная повязь часоў" – гэта аповед пра іменаслоў, што перайшоў ад продкаў да нашчадкаў як моўная спадчына, у якой "што ні назва – то схаваная загадкавая семантыка, незвычанйны водгук укладу штодзённага жыцця прапродкаў – чарадзейнае акенца ў свет своеасаблівага этналігвістычнага феномену Берасцейшчыны, які захоўвае асаблівую прыцягальнасць і, разам з тым, чароўную таямнічасць сваіх імёнаў" [1, с. 5]. Лёсы Брэста і берасцейцаў – прадмет мастацкага асэнсавання ў цыкле твоў Васіля Сарычава "У пошуках страчанага часу". Важнае месца ў аповедзе пра гісторыю горада і гараджан займаюць уласныя імёны розных разрадаў.

Антрапонімы, выкарыстаныя ў навукова-папулярным тэксце, дазваляюць прасачыць змены ў сістэме мовы, вызначаныя культурнымі і палітычнымі падзеямі ў грамадстве. Антрапанімія навукова-папулярных твораў сучасных берасцейскіх аўтараў абапіраецца на агульнанародны беларускі іменаслоў.

Героі твораў Мікалая Пашкевіча – простыя вяскоўцы – з'яўляюцца носьбітамі традыцыйных хрысціянскіх каляндарных імёнаў, што прыйшлі ў беларускі іменаслоў з грэчаскай (***Агаф'я (Гапа), Дзмітрый (Міцё), Еўдакія (Оўдзя), Мінай (Мінё***), ***Паліна (Поля), Трахім (Трохім), Яўгенія (Ёўга***), лацінскай (***Клім, Матруна, Разалія (Рузя), Усціння (Юста), Ціт***), старажытнаяўрэйскай (***Ева, Гаўрыло, Назар, Сара***) моў. Сярод традыцыйных онімаў вылучаюцца прапрыяльныя лексемы славянскага паходжання: ***Браніслава (Броня)*** і ***Вацлаў (Вацік).*** Мікалай Пашкевіч называе такія імёны рэдкаўжывальнымі. Аўтар адзначае: "*Сёння частку рэдкаўжывальных імёнаў можна ўзнавіць толькі на падставе сямейных мянушак. Статус мянушкі набыло рэдкаўжывальнае асабовае імя* ***Каленік (Каліна)****. Зараз нямногія рубельцы ведаюць, што мянушка* ***Хіма*** *паходзіць ад жаночага імя* ***Яўхімія***" [2, с. 155]. Брэсцкі пісьменік фіксуе сямейна-родавыя мянушкі аднавяскоўцаў, асновай якіх сталі ўжывальныя ў папярэдніх пакаленнях рубельцаў асабовыя імёны: ***Базыль (Васіль),***

***Дзем'ян (Дзям'ян), Карп, Кірэй (Кір, Кір'ян), Купрыян, Вэр'ян (Авяр'ян), Сеня (Ксенія), Давід (Давыд)***.

На старонках твораў пісьменніка знаходзім шматлікія дыялектныя формы онімаў, якія перадаюць мясцовы каларыт: ***Зоня, Зыня, Зонька; Ладзё, Ладзік; Пэлё, Пэлік; Сцелё, Сцелько***. Мікалай Пашкевіч умела рэалізуе ацэначна-характарыстычную ролю асабовых імёнаў, якія ў беларускай культуры ўжываюцца ў розных фармальных разнавіднасцях: поўнай (афіцыйнай, пашпартнай), гіпакарыстычнай і мностве эмацыйна афарбаваных формаў. Так, выкарыстанне складанай канструкцыі – спалучэння асабовага імені з іменем па бацьку (такія формы звароту, паводле меркавання даследчыкаў этыкету, прыйшлі ў беларускую мову з рускай) – сведчанне пашаны да чалавека, напр.: "*Нямала было і тых, хто назаўсёды звязаў свой прафесійны шлях з Рубельскай школай.* ***Віктар Макаравіч Кез, Вера Андрэеўна Красуцкая-Кез*** *(заслужаная настаўніца БССР),* ***Васіль Мікітавіч Антоненка, Іван Васільевіч і Ніна Пятроўна Максімовічы***" [2, с. 30]. Паказчыкам прыязнасці і ветлівасці, спаконвечнага родавага адчування блізкасці землякоў з'яўляюцца ўжывальныя ў вясковым асяроддзі формы звароту "дзядзька", "цётка", "дзед", "баба" + імя: "*Задаволены тым, што змог уважыць просьбу бездапаможнай жанчыны, Іван іранічна-паблажліва адказваў: «Дзякуй вам,* ***цётка Ганна****, што дапусцілі да работы»*" [2, с. 42].

Дзякуючы гнуткасці, пластычнасці, здольнасці перадаваць тонкія нюансы чалавечых адносін, асабовае імя адыгрывае ў замалёўках вясковага жыцця важную ролю, з'уляючыся носьбітам сацыяльна і асобасна значнай інфармацыі аб герою (паважаны чалавек у соцыуме ці не, малады ці сталага ўзросту), перадаючы багатую гаму эмоцый, пачуццяў, ацэнак: "***Верэ****, ты чуеш,* ***Верочка****, я цебэ прошу: накажыно там мойму* ***Грышы****, хай пэрэвэзэ мэнэ*" [2, с. 19]; "*А ты памятаеш* ***Мішку****? – ажывіўся мой даўні знаёмы. – Ён і так гаварун, а калі вып'е, то і ўвогуле, як кажуць, рот не закрываецца*" [2, с. 43]; "*Мая дзіцячая памяць зафіксавала тую трагедыю вяскоўцаў найперш таму, што загінула наша суседка* ***Лексочка****, яе дачка* ***Каця*** *і немаўля*" [2, с. 43]; "*Нязменным кантралёрам, які запускаў у залу гледачоў, быў* ***дзядзька Косця****, ці, як усе яго звалі, проста* ***Косця***" [2, с. 26]; "*Дзякуй табе,* ***Іваначка****, за работу*" [2, с. 42].

Праз актуалізацыю прагматычнай значнасці шматлікіх формаў асабовых імёнаў Мікалай Пашкевіч стварыў яркія замалёўкі жыцця аднавяскоўцаў, перадаў традыцыі іменавання, выразіў тонкія адценні ацэнак, эмоцый, пачуццяў, зафіксаваныя ў моўнай свядомасці беларусаў, адлюстраваў уласцівыя роднай гаворцы моўныя асаблівасці.

***Мянушка*** – адзін з самых старажытных і цікавых складнікаў антрапанімічнай лексікі. Характарыстычная функцыя мянушак у сённяшнім грамадстве выходзіць на першы план. Праўда, часам і зараз

неафіцыйнае празванне може быць важным сродкам ідэнтыфікацыі чалавека. Мікалай Пашкевіч ва ўспамінах пра родную вёску адзначае: “*Частотнасць аднастайных прозвішчаў прыводзіць да таго, што некаторыя вяскоўцы з'яўляюцца поўнымі цёзкамі. Раней, калі ў пераважнай большасці рубельцаў сем'і былі вялікія, часам і ў адным класе вучыліся поўныя або амаль поўныя цёзкі. Па гэтай прычыне даводзілася нумараваць школьнікаў, напрыклад: Вабішчэвіч Іван Іванавіч (1), Вабішчэвіч Іван Іванавіч (2). Найбольш распаўсюджанымі ў Рублі з'яўляюцца прозвішчы* ***Агіевіч, Вабішчэвіч, Ляшкевіч, Машлякевіч, Пашкевіч****. На бытавым узроўні звычайна мянушка дае магчымасць індывідуалізаваць асобу ці сям'ю:* ***Вероччын Васіль, Дзенісоў Сцепан, Міколчын Міша, Яковіна Маня, Мінчына Зоня*** *і інш.*” [2, с. 159].

У асяроддзі вяскоўцаў вылучаюцца ***калектыўна-тэрытарыяльныя мянушкі*** – празванні жыхароў пэўнага населенага пункта. Ва ўспамінах Мікалая Пашкевіча прыводзіцца найменне-характарыстыка аднавяскоўцаў пісьменніка і акрэсліваецца яго матывацыя: «*Згадваючы сваю вандроўку па Століншчыне, Уладзімір Караткевіч піша: “Рэдкія там вёскі, але, як кажуць, меткія. У вёсцы Рубель 1800 двароў – «Гэто ж наш* ***Кітай****» (мясцовы жарт)”. Сапраўды, падчас майго дзяцінства і юнацтва нярэдка нас, рубельцаў, жыхары суседніх вёсак называлі* ***кітайцамі***» [2, с. 11].

Значную частку неафіцыйных празванняў вяскоўцаў займаюць ***сямейна-родавыя (генесіянімічныя)*** мянушкі. У іх ліку пісьменнік вылучае ***патронімы***, базай утварэння якіх становяцца імёны продкаў па мужчынскай лініі: “*Мянушка* ***Пэтрыніные*** *ўтворана ад імя* ***Пэтро, Косцючковые*** *– ад* ***Костусь*, *Саўчыные*** *– ад* ***Сава****. Такіх мянушак у рубельскай гаворцы параўнальна нямнога. Звычайна імі абазначаны род, які належыць да былой шляхты*” [2, с. 186]. Словаўтваральнай базай ***матранімічных мянушак*** вяскоўцаў з'яўляюцца імёны продкаў па жаночай лініі, да якіх далучаюцца суфіксы *-к-, -очк-, -ечк-:* ***Верочка, Манька, Мар'ечка, Марынка, Паўлінка*** [2, с. 186]. М. Пашкевіч адзначае, што статус мянушкі атрымліваюць рэдкаўжывальныя імёны ***Ёўга, Прося, Тэкля, Рузя, Хіма, Юстына*** [2, с. 186].

Ацэначна-характарыстычную функцыю выконваюць ***індывідуальныя мянушкі***, у якіх адлюстраваны ўяўленні вяскоўцаў аб нормах паводзінаў, ладзе жыцця, прыгажосці і інш. У першую тэматычную групу выдзелены мянушкі-замалёўкі знешнасці сялян: ***Гурбочка, Кучко, Куцы, Лысы, Мэляўка, Покорпаны, Трубач, Стройны, Сыты, Цыган, Шнур, Бэзрукі, Глухі, Зубэль, Клішун, Кульпач, Носар, Почка, Сіпак, Слепцоў, Бусько, Ворончук, Вуташка, Драч, Пугач, Курка, Соловэй, Соўка, Вэчка, Кот, Кошка, Моркач, Осенчак, Воўк, Заец, Козлік, Лось*** [2, с. 185–186]. На ўнутраныя якасці індывідаў паказваюць наступныя мянушкі: ***Корпаец, Мазунец (ліслівец), Рэўкач, Срой (пра неўраўнаважанага чалавека),***

***Сонда (санлівец), Стойковэц, Шпаркі*** [2, с. 186]. На сацыяльны, маймасны статус, нацыянальнасць, прафесію, становішча ў сям'і носьбіта празвання ці яго продкаў паказваюць мянушкі ***Багатыроў, Босякоў, Дранец, Король, Покіданка, Прымачок, Касір, Коваль, Морак, Музыкант, Мэлэчко, Панамар, Партізан, Пісар, Поп, Прокурор, Сторожоў, Стрэлец, Шкуратнік***. Аўтарскі кантэкст раскрывае матывацыю гаваркіх антрапонімаў: "*Мянушка* ***Воспан*** *успрымаецца як напамін пра былую рубельскую шляхту. Вядома, што словы* ***васпан*** *і* ***васпані*** *служылі формай ветлівага звароту ў шляхецкім асяроддзі. Ці выкарыстоўвалася раней вяскоўцамі слова* ***васпан*** *як зваротак да асобы, цяпер цяжка сказаць. У гаворцы яно як акрамя мянушкі больш ніяк не выяўляецца"* [2, с. 187]. Характарыстыкай маўлення вясковай жанчыны з'яўляецца мянушка ***Майнэрыха***, аснова ўтварэння якой – часта ўжывальнае дыялектнае слова: «*У рубельскай гаворцы ўжываецца слова* ***майна*** *са значэннем 'трава, якая расце на вадаёмах'. "Пойду нарву* ***майны*** *свінням" ці "Поўны кошэль* ***майны*** *прынэсла", – гаварыла вясковая жанчына. Пачутае некалькі разоў суседзямі рэдкаўжывальнае слова з вуснаў рублянкі прадвызначыла яе мянушку –* ***Майнэрыха***» [2, с. 188]. Ужыты ў творах М. Пашкевіча мянушкі-празванні паводле месца жыхарства вяскоўца. Так, у сялянскім асяроддзі прынята называць замужніх жанчын паводле вёскі, дзе яны жылі да замуства: "***Дуброўчанка*** *(ад назвы вёскі* ***Дуброва), Вэлемічанка*** *(ад –* ***Вялемічы), Ольпенка*** *(ад –* ***Альпень), Хотомлянка*** *(ад –* ***Хотамель***)" [2, с. 185].

З'яўляючыся найбольш старажытным разрадам антрапанімічнай лексікі, мянушкі працягваюць сваё жыццё ў асяроддзі сучасных вяскоўцаў, даючы ім магчымасць ярка абмаляваць найбольш кідкія рысы знешнасці чалавека, апісаць і ацаніць яго характар і маўленне, акрэсліць сваяцкія адносіны паміж людзьмі. А каштоўнасць сямейна-родавых (генесіянімічных) і калектыўна-тэрытарыяльных мянушак у тым, што яны захоўваюць інфармацыю аб гісторыі продкаў сям'і і жыхароў пэўнага населенага пункта.

**Прозвішчы** – гэта спадчынныя ўласныя назвы, якія ўказваюць на прыналежнасць чалавека да пэўнай сям'і, роду. У навукова-папулярных творах Мікалая Пашкевіча можна выдзеліць, па-першае, прозвішчы, утвораныя ад кананічных і размоўных формаў хрысціянскіх імён (***Максімовіч, Пашкевіч, Агіевіч***), па-другое, прозвішчы, што ўзніклі ад язычніцкіх празванняў-мянушак апелятыўнага паходжання (***Красуцкая, Вабішчэвіч, Ляшкевіч, Машлякевіч, Кажаноўскі, Жалянгоўскі***). Прозвішча – сацыяльна характарыстычная прапрыяльная адзінка, якая паказвае на становішча сям'і ў грамадскай іерархіі. Так, шляхецкія прозвішчы, як правіла, уключаюць фарманты -віч-, -іч-, -ск(і). У зборніку "У родным слове адгукаецца душа" Мікалай Пашкевіч прыгадвае прадстаўнікоў шляхецкіх родаў, што жылі ў роднай вёсцы – ***Пашкевічаў***,

***Апановічаў, Вабішчэвічаў, Жалянгоўскіх, Кажаноўскіх, Ліпскіх, Ляшкевічаў, Разановічаў***. Пісьменнік разважае: «*Аўтарытэт шляхецкага роду напрацоўваўся з пакалення ў пакаленне і, як мне здаецца, у нейкай ступені прадвызначаў паводзіны кожнага, каму было наканавана нарадзіцца ў сям'і шляхціча. Ва ўсякім выпадку, у дзяцінстве мне не даводзілася чуць, каб нехта, напрыклад, з майго роду вызначаўся амаральнасцю, парушаў вякамі ўсталяваныя традыцыі, да непрыстойнасці прынізіў годнасць іншага чалавека, выйшаў за межы закона. Безумоўна, гэта не азначала, што ўсе бытавыя канфлікты вырашаліся на мажорна-добразычлівай ноце. Характар – справа складаная, супярэчлівая, нярэдка ўнікальная, якая не заўсёды прадвызначаецца сацыяльным статусам чалавека. У Рублі кажуць: "Натуру чоловека не пэрэмэніш – якім вон родівса, такім і ўмрэ*"» [2, с. 23–24].

Прозвішчы палешукоў – паказчык міжэтнічных кантактаў. Мікалай Міцковіч прыгадвае прозвішчы нашчадкаў венграў-воінаў, якіх прывёў у Рэч Паспалітую для барацьбы з Масковіяй трансільванскі князь Стэфан Баторый: ***Беняш, Бекеш, Барташук, Галаш, Мандра, Войнаш, Кендыш*** і інш. [2, с. 36]. Называе пісьменнік і палавецка-цюрскія прозвішчы (***Баран, Кананові, Кунашка***), і антрапонімы, якія ўзыходзяць да адной з найстаражытнейшых цюркскіх моў – караімскай: ***Бама, Буза, Казей, Казыровіч*** і інш. [1, с. 35].

Дзейнымі асобамі навукова-папулярнай літаратуры з'яўляюцца жыхары старажытнага Берасця. Так, Васіль Сарычаў прыгадвае дакументы сярэднявечнага горада, напрыклад, Інвентар 1566 года. Формы наймення берасцейцаў з'яўляюцца паказчыкам іх сацыяльнага статусу. Так, купцы і рамеснікі называюцца па імені з указаннем прафесіі, роду дзейнасці (***Ян постригач, Курило коваль, Станислав аптикар, Миско мечник***) або па імені ў спалучэнні з прозвішчам (***Михно Розчич, Ганна Олиферова, Софея Адамкова, Станислав Пекарский, Яско Олиферович***). Прадстаўнікі вышэйшых саслоўяў названы па імені ў спалучэнні з іменем па бацьку (князь ***Юрий Олелькович***). Што да прозвішчаў сярэднявечных берасцейцаў, то ў іх складзе можна вылучыць антрапонімы, утвораныя ад хрысціянскіх імёнаў (***Олиферович, Адамкова, Тарасович, Васюкович, Андриевич, Карпович, Ярмошова, Остапкович***), а таксама ад язычніцкіх празванняў-мянушак, матываваных найменнямі флоры і фаўны (***Дубинка, Шпакович, Козловски, Сорока***), назвамі прафесій, месца жыхарства, сацыяльнага статусу (***Пекарский, Новосельский, Золотарь, Паненчин***), частак цела (***Лобик***), страў (***Скиба***) [3, с. 18].

Рэалізуючы асветніцкую функцыю навукова-папулярнай літаратуры, сучасныя берасцейскія аўтары ўмела раскрываюць у кантэксце твораў этымалагічную семантыку тапонімаў, актуалізуючы сканцэнтраваную ў старажытных прапрыяльных адзінках інфармацыю аб гістарычным

мінулым славянскіх плямёнаў. У ліку тапонімаў, якія ўваходзяць у анамастычную прастору навукова-папулярнай літаратуры пісьменнікаў Берасцейшчыны, можна вылучыць прапрыяльныя адзінкі, прагматычная зона семантыкі якіх захоўвае наступныя культурныя ўяўленні, якія складаюць аснову менталітэту славянскіх народаў. Кантэкст навукова-папулярнага твора актуалізуе нацыянальна-культурную інфармацыю тапонімаў. Гэта ўяўленні пра культ раслін і жывёл: "***Волковичи*** *– бывший хутор в Ленинском сельсовете Жабинковского района. Возможно, название кельтско-балтского происхождения, ср. лит.* ***vilkas*** *– волк. На балтийский корень указывает территориальная близость названий урочищ* ***Волчий Брод (Viliskal Brasta)****,* ***Волково, Волченисово, Волчин*** *и др. Предположительно, в этих названиях запечатлено имя одного из проживавших в древности на территории Беларуси кельтских племён* ***велетов*** *(кельтск. Veltos), признававших культ* ***волка***" [1, с. 45]. Шэраг тапонімаў утвораны ад назваў плямёнаў: "***Пруска*** *– деревня в Яковчицком сельсовете Жабинковского района. Название этнонимического происхождения от западнобалтийского народа –* ***пруссов*** *или немцев, насильственно германизировавших* ***пруссов*** *и ставших носителями этого этнонима*" [1, с. 68]. Тапонімы могуць утрымліваць інфармацыю пра гаспадарчую дзейнасць людзей: «*Можно интерпретировать топоним "****Мушкетно****" на Жабинковщине как место, где татарами изготовлялись* ***мушкели*** *– дубинки, оправленные железом. Название "****Корды****" выводится от тюркского* ***корд*** *'вид холодного оружия'*» [1, с. 34]; *"Назвай* ***Волыня*** *рубельцы абазначылі луг, дзе раней пасвілі* ***валоў*** *– непаваротлівых, але цягавітых жывёлаў: імі даводзілася араць зямлю, выконваць іншыя сельскагаспадарчыя работы*" [2, с. 167]. Унутраная форма тапонімаў можа ўказваць на сацыяльную структуру грамадства: *"У цэнтральнай частцы вёскі жыла* ***шляхта****; за царквою, бліжэй да Хатомеля, –* ***мужыкі****, што і адлюстравалася ў мікратапонімах сяла:* ***Шляхта*** *і* ***Мужыкі***" [2, с. 24–25].

Каларыт даўніны ствараюць ***устарэлыя ўласныя назвы***, якія паводле іх суадносінаў з сучаснымі найменнямі падзяляюцца на ***археонімы*** і ***гістарыёнімы***. Частка ***ўстарэлых онімаў*** цалкам адрозніваецца ад сучасных назваў сваім фона-марфалагічным складам. Гэта ***ўласналексічныя археонімы.*** Васіль Сарычаў праз кароткія ўстаўныя канструкцыі, а часам праз разгорнуты гістарычны каментар падае чытачу суадносныя з ***археонімамі*** сучасныя найменні, а таксама акрэслівае матывацыю найменняў, прадстаўляючы гісторыю герояў, чыімі імёнамі былі названы вуліцы Брэста: "*В городе, окружённом с востока оперативной группой майора* ***Домбровского****, ещё находились немцы, отступавшие к вокзалу, где стояли готовые к отправке последние эшелоны. Смысла препятствовать отбытию немцев не было, но разгорячённые поляки бросились на штурм, в ходе которого пулемётная*

*очередь сразила капитана* ***Владислава Стецкевича****, командира отряда из группы Ежи* ***Домбровского****. На месте гибели капитана, у пешеходного моста через пути, установили памятник, а улицу* ***Вознесенскую*** *(ныне* ***Комсомольская)*** *переименовали в улицу* ***Стецкевича****. Ещё две улицы –* ***Збироговская (ныне Будённого)*** *и* ***Миллионная*** *(ныне* ***Советская)*** *– в память тех дней получили имена Антония* ***Листовского*** *и Ежи* ***Домбровского*** *(а не генерала Парижской коммуны Ярослава Домбровского, как можно по ошибке предположить)*” [2, с. 55].

***Гістарыёнімы*** з’яўляюцца найменнямі паняццяў, якія зніклі з жыцця соцыуму і з мовы. Напрыклад, у кантэксце твора Васіля Сарычава выкарыстоўваюцца найменні старажытных, дзяржаў, адміністрацыйных адзінак (***Арабский халифат, Византия, Великое княжество Литовское, Речь Посполитая, Берестейское староство***), назвы грамадскіх і камерцыйных аб’яднанняў – ***эргонімы*** (мебельный магазин “***Шмуль Хаит и сын***”, цукерня “***Гдыня***”, ***Строительный комитет, Ссудно-строительная комиссия, “Торговый пассаж Ретнера***”).

Важную ролю ў жыцці нашых продкаў і сучаснікаў адыгрывала і адыгрывае рэлігія. Таму ў навукова-папулярныя творы ўводзяцца розныя разрады онімаў, якія звязаны з рэлігійным светапоглядам народаў, што насялялі Беларусь. Расказваючы пра мінулае і сучаснасць, Васіль Сарычаў і Мікалай Пашкевіч ужываюць шматлікія найменні культавых збудаванняў (***эклезіёнімы***): і тых, што зніклі (***гістарыёнімы***), і тых, у якіх і зараз вядзецца набажэнства: “*На Центральном острове размещались двор православного епископа с* ***Николаевской церковью, Фарный****, т.е. главный, костёл, красивейшая в Европе синагога «****Бриск де Лита****»*” [3, с. 102]; “*Зараз у Рублі насупраць драўлянай* ***Міхайлаўскай царквы*** *ўзведзены новы царкоўны будынак, без якога ўжо цяжка ўявіць архітэктурны воблік Рубля. Духоўнае жыццё маіх аднавяскоўцаў працягваецца*” [2, с. 17].

Анамастыкон навукова-папулярных твораў Мікалая Пашкевіча, Мікалая Міцковіча і Васіля Сарычава мае агульнабеларускі нацыянальны характар. Шырока прадстаўлены ў анамастычнай прасторы прааналізаваных зборнікаў рэгіянальны кампанент. Ядром сістэмы асабовых імёнаў, адлюстраванай у творах, з’яўляецца хрысціянскі іменаслоў, асвоены нацыянальнай мовай і мясцовай гаворкай. Інфармацыйная нагрузка мянушак і прозвішчаў перадае асаблівасці ўспрымання і ацэнкі моўцамі знешнасці, маральных якасцей, паводзінаў асобы, сацыяльную структуру грамадства. Аўтары ўмела актуалізуюць прагматычную значнасць тапонімаў і эклезіёнімаў, адкрываючы чытачу каштоўныя звесткі аб матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў, што жывуць на Берасцейшчыне.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Мицкович, Н. С. Топонимическая связь времён / Н. С. Мицкович. – Мозырь : Белый ветер, 2002. – 131 с.

2. Пашкевіч, М. І. У родным слове адгукаецца душа / М. І. Пашкевіч. – Брэст : Альтернатива, 2012. – 196 с.
3. Сарычев, В. В поисках утраченного времени / В. Сарычев. – Брест : ОАО «Брестская типография», 2006. – 308 с.